


# Марк Шагал

**Марк Шагал нарадзіўся і вырас у Віцебску.**

У Беларусі, дзе спрадвеку жылі ўсе ягоныя продкі, а сярод іншых – прадзед Мордух Сегал, які распісваў сінагогі ў беларускіх гарадах.

Апроч выключна тутэйшых, беларускіх каранёў, Шагал атрымаў і ўсю адукацыю ў Беларусі, пачынаючы ад хедара і вучэльні да ўласна мастакоўскай, у школе Юдаля Пэна.

Ва ўласна Расіі ён вучыўся паўтара года ў прыватнай школе Званцавай, у Пецярбургу, але таксама ў земляка, родам з Беларусі, Леона Бакста. А затым вярнуўся ў Беларусь. Назваць Шагала “рускім” мастаком на падставе ягонага расійскага грамадзянства можна з гэткай жа рацыяй, што і ўсіх тагачасных мастакоў Фінляндыі, Польшчы, Літвы і Грузіі. Карэктнаю дэфініцыяй было б – беларускі і французскі мастак габрэйскага паходжання.

Да таго ж трэба зазначыць, што менавіта Марк Шагал аднавіў сістэму мастакоўскае адукацыі ў Беларусі, што існуе і да сёння. Філіялы ягонае Віцебскае мастацкае школы былі створаныя ў іншых беларускіх гарадах – Полацку, Воршы, Лепелі. Пазней школа Шагала ў Віцебску стала Беларускім мастацкім тэхнікумам, адзінай да вайны прафесійнай мастакоўскай навучальнай установаю, дзе адвучыліся два пакаленні мастакоў з усёй Беларусі.